УДК 821.161.3 (075.8)

*С. Э. Сомаў*

# АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АРХІЕПІСКАПА ГЕОРГІЯ КАНІСКАГА Ў МАГІЛЁВЕ (СВЕТАПОГЛЯДНЫЯ ВЫТОКІ І АСНОЎНАЯ МАТЫВАЦЫЯ)

**Анатацыя.** Аналізуюцца светапоглядныя вытокі і асноўныя матывы актыўнай і шматграннай асветніцкай дзейнасці архіепіскапа Магілёўскага і Беларускага Георгія Каніскага (1717–1795), які ўвайшоў у гісторыю Беларусі не толькі як выдатны царкоўны дзеяч, свяціцель-прапаведнік, змагар за свабоду сумлення, але і як вучоны, прафесар некалькіх навук, аўтар гісторыка-юрыдычных даследаванняў, заснавальнік шэрага навучальных устаноў, у тым ліку Магілёўскай духоўнай семінарыі.
**Ключавыя словы**: Георгій Каніскі, асветніцкая дзейнасць, адукацыя, Кіева-Магілянская акадэмія, Магілёў, семінарыя, рэлігійная вера, перакананні, матывы, служэнне.

Георгій Каніскі займае асаблівае месца ў гісторыі Магілёўшчыны і Беларусі ў цэлым. На працягу 40 гадоў, з 1755 г. па 1795 г., ён з’яўляўся кіруючым епіскапам (пазней архіепіскапам) г. Магілёва, які да першага падзелу Польшчы быў цэнтрам адзінай праваслаўнай епархіі на беларускіх землях. Так склаўся лёс Каніскага, што на працягу ўсяго асэнсаванага жыцця ён займаўся асветніцкай дзейнасцю як у вузкім, так і ў шырокім сэнсе слова. Ён сам як прафесар шмат пісаў і выкладаў, як епіскап звяртаўся да народа з пропаведзямі (царкоўнымі словамі), друкаваў у заснаванай ім жа друкарні духоўна-асветніцкую літаратуру, адкрываў царкоўна-прыходскія школы, заснаваў і развіваў Магілёўскую духоўную семінарыю і інш.

Вынікі бурнай і па сутнасці энцыклапедычнай дзейнасці Каніскага зафіксаваны ў многіх гісторыяграфічных сачыненнях і, можна сказаць, для вучоных ужо носяць праграмны характар (хоць мала вядомы шырокай аўдыторыі з прычыны адсутнасці інфармацыі пра жыццё і творчасць гэтага выдатнага асветніка ў школьных падручніках і дапаможніках). Цікавасць уяўляюць вытокі і матывы тытанічных намаганняў Георгія на ніве асветы, не аднойчы звязаныя нават з рызыкай для яго жыцця, паколькі да першага падзелу Рэчы Паспалітай яму давялося развіваць асвету ў складаных умовах міжрэлігійнай канфрантацыі і ўніяцка-каталіцкіх ганенняў на дысідэнтаў, да якіх тады адносілі праваслаўных і пратэстантаў.

Вытокі асобы Каніскага, які самаахвярна прынёс сваё жыццё на алтар служэння царкве і народу, безумоўна, знаходзяцца ў яго дзяцінстве і юнацтве. Яго моцны характар і маштабны розум сфарміраваліся на ўкраінскіх землях, паколькі Георгій быў нашчадкам заможнага казацкага роду і лепшым выпускніком Кіева-Магілянскай акадэміі, у якой пазней ён на працягу 10 гадоў

займаўся ўласна педагагічнай працай і прайшоў шлях ад выкладчыка паэтыкі да прафесара кафедры багаслоўя і рэктара.

Атмасфера ўкраінскага казацкага круга ў першай палове XVIII ст. была насычана праваслаўнай верай і культурай. Рэлігійнасць пранікала ва ўсе сферы жыцця: уладкаванне сям’і як Царквы, жылля як храма, падпарадкаванне гадавога цыкла працоўнай і духоўнай актыўнасці царкоўнаму календару і ўсяго цыкла чалавечага жыцця – устаноўленай сістэме царкоўных таінстваў і абрадаў. Таму натуральным чынам з самага ранняга дзяцінства, праз зносіны са старэйшымі пакаленнямі, слуханне малітваў, святых тэкстаў і пропаведзяў, усведамленне сэнсу іканаграфічных выяў, убачаных у храме і дома, і многае іншае, менавіта рэлігійныя ўяўленні пра светаўладкаванне (пры ўсім іх усходнеславянскім дваяверным або «двоесусветным» характары) уваходзілі ў свядомасць дзіцяці, вызначаючы яго суб’ектыўную карціну свету, меркаванні аб месцы ў ім чалавека і тых каштоўнасцях, якія вызначаюць яго паводзіны.

У адносінах да сям’і Каніскіх значэнне праваслаўных рэлігійных поглядаў і каштоўнасцей уяўляецца важным удвая, і не толькі таму, што яны жылі ва ўкраінскім горадзе Нежыне ў перыяд масавай рэлігійнасці, але яшчэ і таму, што адносіліся да старажытнага і вельмі паважанага казацкага роду. Пачуццё ўласнай годнасці і ўпэўненасць у сабе, якія ярка выявіліся ўжо ў сталым узросце падчас зносін Каніскага з імператарамі, каралямі і ідэйнымі ворагамі, былі заснаваны на ўсведамленні свайго сацыяльнага статусу. Каніскі па паходжанні і ладзе жыцця не быў плебеем, а, наадварот, з’яўляўся нашчадкам вольных, годных і паважаных людзей. Дастаткова зазначыць, што яго продак нежынскі шляхціц Ерамей Каніскі за заслугі перад каронай меў імянную грамату караля Яна-Казіміра на вызваленне ад падаткаў і воінскіх пастояў; дзед будучага асветніка беларускіх земляў Іван Каніскі быў войтам, дзядзька Рыгор Каніскі служыў у гарадскім магістраце, а бацька, Осіп Іванавіч Каніскі, быў соценнымураднікам Нежынскага казацкага палка, палкавым выезджым для збору пошлін у г. Барзна, а пазней, з 1727 г., – бургамістрам горада Нежына.

Акрамя свецкіх «арыенціраў на годнасць», Рыгор (імя асветніка ад хрышчэння) меў і рэлігійныя ўзоры, прычым выбітныя, галоўны з якіх – старац Іаў Каніскі. Ім вельмі ганарыліся ў родзе, паколькі ў другой палове XVII ст. ён манахам падвізаўся ў адным з найстаражытнейшых і праслаўленых на Русі Кіева-Пустынна-Мікалаеўскім манастыры на Аскольдавай магіле. Захаваліся пісьмовыя сведчанні пра яго ролю ў царкоўным жыцці Украіны. Так, вядучы біёграф Георгія Каніскага протаіерэй Міхаіл Буглакаў паказвае, што «в 1680 г. старец Иов участвовал в избрании во игумена этого монастыря Варлаама Ясинского, впоследствии Митрополита Киевского, и поставил свою подпись за его кандидатуру на избирательном акте» [1, с. 61].

Такім чынам, казачая самадысцыплінаванасць, годнасць і ваяўнічасць, злучаныя з глыбокай рэлігійнасцю, якая выявілася не толькі ва ўсёй творчасці

Каніскага, але, перш за ўсё, у факце прыняцця ім манаства, а затым архіерэйства, стварылі тую псіхалагічную аснову, на якой сфарміраваўся цвёрды характар яркага змагара за свабоду сумлення ў Рэчы Паспалітай. Светапоглядную ж аснову яго асобы склалі праваслаўныя рэлігійныя ўяўленні пра Бога, несмяротную чалавечую душу, пра пекла і Царства Нябеснае, пра грэх і дабрадзейнасць, якая адкрывае шлях да выратавання, гэта значыць – пра неабходнасць духоўнага падзвіжніцтва, нядрэмнасці.

Нягледзячы на вядомую ілюзорнасць рэлігійных уяўленняў, яны сталі цвёрдай «светапогляднай матрыцай» свядомасці Георгія на ўсё жыццё. Яго акадэмічная вучонасць пазней толькі напоўніла гэтую ўніверсальную матрыцу новымі ведамі як навуковага, так і багаслоўскага характару, але ніколі ўжо яе прынцыпова не перабудоўвала.

Архірэйская хіратонія Георгія Каніскага ў епіскапа Магілёўскага і Беларускага адбылася 26 жніўня 1755 г. у Кіеве, калі яму было 38 гадоў. Калі епіскап Георгій прыехаў у Магілёў, то знайшоў стан адзінай на той час Беларускай епархіі (усе астатнія ўжо былі знішчаны: пераведзены на ўнію або каталіцызм) занядбаным ва ўсіх адносінах: інтэлектуальным, духоўным, адміністрацыйным, фінансавым. Епіскап убачыў непрывабную карціну разумовага і маральнага невуцтва ніжэйшых слаёў насельніцтва і нават святарства. Рэлігійнае запусценне было выклікана працяглымі ганеннямі на праваслаўе з боку каталіцкай шляхты, рымскага і ўніяцкага духавенства, якое ў галіне асветы выявілася ў закрыцці праваслаўных школ, адсутнасці семінарый.

«Но – ныне кому неизвестно, в каком жалком виде наша Благочестивая Вера в сем Государстве? – адзначаў Георгій у 1767 г. у «Слове на день рождения Ея Императорскаго Величества Государыни Императрицы и Самодержицы Всероссийской, Екатерины II». – ... В Литовском Великом Княжестве хотя и осталась последняя Епархия Белорусская: однако и сия большею частию расхищена. Могли вы еще видеть в ней некое число Церквей Православных, но и те сараям паче и хлевникам скотским подобны, а не храмам Христианским ...

Таково Церквей внешних и рукотворенных состояние, плача достойное, но еще гораздо плачевнейшее внутренних, нерукотворенных, самаго, говорю, сословия Правоверных Христиан. Отнят от них свет учения: школам и семинариям быть не допускают; а потому не только низкого состояния люди, но и само дворянство в крайней простоте и невежестве принуждено жить» [3, с. 89–90].

Грамадскі прагрэс Свяціцель звязваў з развіццём навукі і адукацыі; здольнасць да навукі ўспрымалася ім як спецыфічная рыса чалавека, уласцівая яму незалежна ад сацыяльнага становішча. На Магілёўскай кафедры Каніскі выступіў гарачым прыхільнікам асветы, і ў аснове яго актыўнасці на гэтай глебе ляжаць як асабістыя духоўныя і навуковыя перакананні ў неабходнасці развіцця чалавечага патэнцыялу, так і надзённыя царкоўна-адміністрацыйныя

задачы: сфарміраваць адукаваную кансісторыю, умацаваць кадры духавенства, развіць сетку царкоўных навучальных устаноў і інш.

Першае, з чаго ён пачаў, – гэта катэхізацыя насельніцтва, навучанне прыхаджан асновам праваслаўнага веравучэння. Ён даручыў двум адукаваным святарам, якія прыехалі з ім з Кіева (Васілю Садкоўскаму і Дзмітрыю Чугаевічу), тлумачэнне для народа ў храмах г. Магілёва Евангелля, тлумачэнне Катэхізіса; затым набыў для святароў «Катэхізіс» Феафана Пракаповіча, а ў 1757 г. заснаваў пры архіерэйскім доме друкарню, у якой выдаў і перавыдаў пазней «Катэхізіс» ужо для народа ў скарочаным і адаптаваным выглядзе, апублікаваў шэраг духоўна-асветніцкіх кніг.

Неўзабаве пасля прыезду на беларускую зямлю ў сваіх лістах і данясеннях у Сінод свяціцель Георгій пачаў рэгулярна гаварыць пра неабходнасць адкрыцця ў Магілёве семінарыі. Так, у 1756 г. ён пісаў: «Для священнических и причетнических детей крайне нужно быть школе, в которой бы по последней мере обучать их на русском хотя языке Закону Божию и членам веры, також и писать, ибо многи из священников ни на русском, ни на польском языке писать не умеют, только одно собственное имя подписать, а потому и репортов от них також и записов метрических нет …; а для острейших детей чтобы можно было и латинского языка содержать семинарию, как в прежнем моем донесении так и ныне прошу … помощь учинить» [1, с. 107].

Ужо ў 1757 г. Георгій заснаваў пры Спаса-Праабражэнскім архірэйскім манастыры школьныя класы, якія ў 1759 г. сталі семінарыяй на ўзор Кіева-Магілянскай акадэміі. Тады ж пад яго кіраўніцтвам пачала фарміравацца сетка царкоўна-прыходскіх школ у Быхаве, Гомелі, Мсціславе, Оршы, Чачэрску і іншых гарадах і мястэчках. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай гэта дзейнасць атрымала новы штуршок, таму што для Георгія наступіў перыяд адноснага спакою. Усходнія тэрыторыі Беларусі былі далучаны да Расійскай імперыі і склалі асобную Магілёўскую епархію, у якой з 1773 г. Каніскі мірна працаваў да канца сваіх дзён.

Асаблівае значэнне асветнік надаваў развіццю Магілёўскай духоўнай семінарыі. У 1780 г. Георгіем быў закладзены новы будынак семінарыі, які ствараўся на працягу пяці гадоў. Дзякуючы новым умовам, у 1785 г. у семінарыі былі адкрыты пашыраныя класы багаслоўя, філасофіі, лацінскай, грэчаскай і польскай моў. Для выкладання дысцыплін у Магілёў запрашаліся прафесары Кіеўскай акадэміі. Георгіем Каніскім была вылучана ідэя стварэння ў Магілёве навучальнай установы ўніверсітэцкага тыпу не толькі для царкоўнай, але і для свецкай адукацыі, у якой выкладаліся б такія дысцыпліны, як грамадзянская гісторыя, геаграфія, юрыспрудэнцыя, фізіка, нямецкая і французская мовы. Аднак гэтым маштабным задумам не наканавана было спраўдзіцца ні ў XVIII, ні нават у XIX ст.: толькі ў 1913 г. у Магілёве з’явіўся Настаўніцкі інстытут, які атрымаў статус універсітэта толькі ў 1997 г.

Не менш важнай для Каніскага была барацьба з маральнымі недахопамі духавенства, манаства і прыхаджан. Ён сам шмат прапаведаваў, аб’язджаючы храмы сваёй епархіі. Агульная колькасць вядомых на сённяшні дзень пропаведзяў Георгія Каніскага – 77. Частка з іх была сабрана ім у «Зборнік павучальных слоў» і выдадзена перш за ўсё для духавенства (гэты зборнік не захаваўся, вядомы сёння збор «Слоў і прамоў» быў складзены ў канцы XIX ст. рэдактарамі «Магілёўскіх Епархіяльных Ведамасцяў» Д. Ціхаміравым і І. Пятніцкім да 100-годдзя з дня смерці Каніскага) [3].

Пропаведзі свяціцеля Георгія мелі вялікае значэнне для маральнага адраджэння беларускага праваслаўнага народа. Яны вызначаліся шчырасцю і прастатой. Невыпадкова А. С. Пушкін, які прысвяціў у 1835 г. першаму збору твораў беларускага асветніка грунтоўны артыкул, ахарактарызаваў прамоўніцкую спадчыну Каніскага наступным чынам: «Проповеди Георгия просты и даже несколько грубы, как поучения старцев первоначальных; но их искренность увлекательна» [4, с. 85–86].

Клопаты пра асвету не пакідалі свяціцеля Георгія да апошніх дзён яго жыцця. Нават цяжка хворы, прыкаваны да ложка, ён клапаціўся пра развіццё семінарыі і ў сваім завяшчанні, складзеным у 1793 г., распарадзіўся перадаць у семінарыю сваю багатую бібліятэку, сабраную за гады выкладчыцкай дзейнасці і служэння ў свяціцельскім званні.

Такім чынам, значныя намаганні Георгія Каніскага распаўсюдзіць адукаванасць у народзе маюць глыбокія карані ў яго шчырай рэлігійнай веры і ў навукова-асветніцкіх перакананнях, сфарміраваных у кіеўскі перыяд яго акадэмічнай вучобы і выкладчыцкай дзейнасці. Плён гэтых намаганняў шматгранны і багаты: па яго кнігах вучыліся некалькі пакаленняў святароў; пазней большасць вядомых дзеячаў асветы на Магілёўшчыне з’яўляліся гадаванцамі і часта выкладчыкамі семінарыі, заснаванай свяціцелем; сабраныя ім кнігі і рэдкія дакументы ляглі ў аснову маштабных гісторыка-краязнаўчых даследаванняў XIX ст.; царкоўныя пропаведзі аказвалі і працягваюць аказваць дабратворны ўплыў на маральны стан праваслаўных хрысціян да цяперашняга часу.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Буглаков, М.** Преосвященный Георгий Конисский, Архиепископ Могилевский / М. Буглаков. – Минск : Виноград, 2000. – 656 с.

2. **Кашуба, М. В.** Георгий Конисский / М. В. Кашуба. – Москва : Мысль, 1979. – 173 с.

3. Слова и речи Георгия Конисского, Архиепископа Могилевского. – Могилев-на-Днепре : Скоропечатня и Литография Я. Н. Подземского, 1892. – 469 с.

4. **Пушкин, А. С.** Собрание сочинений: в 10 т. Т. 6. Критика и публицистика / А. С. Пушкин. – Москва: Художественная литература, 1976. – 508 с.